4. Черчилль, У. Вторая мировая война: сокр. пер. с англ.; кн. третья. – М 1991. – Т. 5-6. – С. 574.
5. Медаль «За победу в холодной войне» [Электронный ресурс].– 2010. – Режим доступа: http://ru.wikipedia.org/wiki – Дата доступа: 12.09.2010.
6. Джозеф Най Рифмы истории. [Электронный ресурс].– 2010. – Режим доступа: http:// http://www.kommersant.ru/daily/
7. Интервью субкоманданте Маркоса Габриэлю Гарсиа Маркесу // Научно-просветительский журнал «Скепсис» [Электронный ресурс].– 2010. – Режим доступа: http:/ http:/scepsis.ru – Дата доступа: 12.09.2010.
8. Месснер, Е.Э. Всемирная мятежевойна. Серия: Геополитический ракурс. – Издательство «Кучково поле». – 2004.
9. Вулси Джеймс. Битва с драконом закончилась. Началась погоня за змеями. Источник: 04 Марта 2005 Washington ProFile [Электронный ресурс].– 2010. – Режим доступа: http:// http://www.agentura.ru – Дата доступа: 14.09.2010.
10. Официальный сайт. – Режим доступа: http://www.rand.org – Дата доступа: 16.09.2010.
11. In Athena's Camp: Preparing for Conflict in the Information Age. John Arquilla and David Ronfeldt, editors. RAND, 1997. – Режим доступа: http://www.rand.org/ publications/ MR/MR1382/ – Дата доступа: 16.09.2010.
12. Networks and Netware: The Future of Terror, Crime, and Militancy. John Arquilla and David Ronfeldt, editors. RAND, 2001. – Режим доступа: http://www.rand.org/ publications/MR/MR1383/ – Дата доступа: 16.09.2010.
13. Крупнов, Ю.В. «Моя война» - Полемика и дискуссии. № 924/ [Электронный ресурс].– 2010. – Режим доступа: http://www.polemics.ru/articles/?articleID=924/ – Дата доступа: 18.09.2010.
14. Потехин, В.К. Современные консциентальные войны и национальная безопасность России: «Кому будет принадлежать консциентальное оружие в XXI веке?». – М., 1997. – С. 69-87.
15. Громыко, Ю.В. Россия – страна без народа? // Российское аналитическое обозрение. – 1998. – №7.
16. Панарин, А.С. Искушение глобализмом. – М., 2000.
17. Кара-Мурза, С.Г. Манипуляция сознанием. – М., 2002.
18. Макаров, В.М. Консциентальное оружие: вызов нового тысячелетия? // Неман. – 2003. – №5.

## ПАЛІТЫЧНАЕ РЭХА КАТЫНСКАЙ ТРАГЕДЫІ

*Ермаковіч Л.І., Рамановіч П.С.*
УА «Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна», г. Брэст

У ноч з 23 на 24 жніўня 1939 г. міністр замежных спраў Германіі І. Рыбентроп і народны камісар замежных спраў Савецкага Саюза В. Молатаў падпісалі ў Маскве пакт аб ненападзе, а таксама сакрэтны пратакол да гэтага дагавора, які вызначыў межы паміж абедзьвума дзяржавамі пасля падзелу польскай дзяржавы.

1 верасня 1939 г. фашысцкая Германія ажыццявіла напад на Польшчу, і пачалася Другая сусветная вайна. Літаральна за два тыдні нямецкія войскі разграмілі асноўныя сілы польскай арміі, а 17 верасня захапілі Варшаву. Выконваючы свае абавязательствы па сакрэтнаму пратаколу пакта Рыбентропа-Молатава, савецкае палітычнае кіраўніцтва аддало загад аб уступленні частак Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну, якое адбылося ў ноч з 16 на 17 верасня 1939 г.

Дэмаралізаваная польская армія не змагла аказаць савецкім войскам сур'ёзнага супраціўлення. Да таго ж польскі галоўнакамандуючы, маршал Эдвард Рыдз-Сміглы ў 16 гадзін 17 верасня выступіў з так званай «агульнай дырэктывай» – загадам не аказваць супраціўлення надыходзячай Чырвонай Арміі. Акрамя таго, па незразумелых прычынах польскі ўрад не палічыў неабходным даць своечасовую палітычную і юрыдычную ацэнку дзеянням кіраўніцтва СССР.

Усе вышэйадзначаныя абставіны прывялі да таго, што польскія часткі, замест самарасфарміравання, здымання з сябе абмундзіравання і пераходу ў падполле, у сваёй большасці здаліся ў палон.

Паводле савецкіх крыніц, Чырвоная Армія ў верасні 1939 г. ўзяла ў палон 230 670 польскіх салдат і афіцэраў. У выніку масавых арыштаў ў наступныя некалькі месяцаў іх колькасць узрасла і дасягнула 250 тысяч чалавек, з якіх 10 тысяч складалі афіцэры [1, с. 8]. Некаторыя салдаты і афіцэры па сваёй непрадбачлівасці самі з'яўляліся ў камендатуры Чырвонай Арміі.

Адразу пасля палону пачалі працаваць спецыяльныя следчыя камісіі НКУС. Кожны вязянь падвяргаўся допыту. Аднак сяржанцка-радавы склад польскіх ваеннапалонных не надта цікавіў следчыя камісіі. Каля 46 тысяч з іх былі вызвалены, больш 180 тысяч былі дэпартаваны ўглыб СССР. Некаторыя з іх пакінулі Савецкі Саюз у 1942 г. ў радах арміі генерала Андэрса, хтосьці трапіў у Польскую армію пад камандаваннем генерала Зыгмунта Берлінга.

Асаблівую ўвагу органы НКУС надавалі польскаму афіцэрскаму корпусу, які складаўся не толькі з кадравых вайскоўцаў, але пераважна з афіцэраў запасу, прадстаўнікоў польскай інтэлігенцыі.

Для польскіх афіцэраў у лістападзе 1939 г. былі створаны тры вялікія лагеры ваеннапалонных. Першы з іх быў створаны ў Казельску, які знаходзіўся на чыгуначнай лініі Смаленск-Тула, у 250 кіламетрах на паўднёвы ўсход ад Смаленска. Лагер размясцілі на тэрыторыі былога манастыра і ў невялікіх доміках-скітах, дзе калісьці размяшчаліся паломнікі. У манастыры ўтрымліваліся афіцэры, узятыя ў палон на нямецкай тэрыторыі, а ў скітах – затрыманыя на савецкай. Гэты падзел праводзіўся паслядоўна, і кантакты паміж абедзьвюма часткамі лагера строга абмяжоўваліся.

Спачатку Казельскі лагер налічваў каля 5 тысяч ваеннапалонных, а ў перыяд яго ліквідацыі (красавік 1940 г.) – каля 4,5 тысяч, так як частка ваеннапалонных была ўжо вывезена ў невядомым напрамку. Сярод вязняў была адна жанчына: падпаручнік-лётчыца, дачка змагара з савецкай уладай на Беларусі ў студзені-лютым 1919 г. – генерала Юзафа Доўбар-Мусніцкага [3, с. 109].

У Казельскім лагеры знаходзілася звыш 20 прафесараў вышэйшых навучальных устаноў, больш 300 дактароў, нскалькі сотняў юрыстаў, інжынераў і настаўнікаў (трэба памятаць, што большасць польскіх ваеннапалонных у СССР, як ужо адзначалася вышэй, складалі афіцэры запасу, мабілізаваныя ў пачатку вайны).

Другі афіцэрскі лагер быў створаны ў Старабельску, ва ўсходняй частцы Украіны, на паўднёвы ўсход ад Харкава. І гэты лагер быў таксама размешчаны ў манастырскіх пабудовах. Сюды прывезлі амаль усіх афіцэраў з раёна абароны Львова. Тут знаходзілася каля 20 прафесараў вышэйшых навучальных устаноў, каля 400 дактароў, некалькі сотняў юрыстаў і інжынераў, каля сотні настаўнікаў, каля 600 лётчыкаў, шматлікія грамадскія дзеячы, група літаратараў і журналістаў. У гэты лагер трапілі ў поўным складзе калектыў НДУ па барацьбе з атрутнымі газамі, амаль увесь калектыў інстытута па ўзбраенню польскай арміі. На апошнім этапе свайго існавання лагер налічваў 3 920 ваеннапалонных [1, с. 10].

Самы буйны лагер ваеннапалонных, у якім змяшчалася каля 6 500 чалавек, быў створаны ў Асташкаве, на паўднёвы захад ад Калініна (былы і сучасны г. Цвер), на адным з астравоў возера Селігер. Як і ў першых дзвюх лагерах, вязняў размясцілі ў

будынках былога манастыра. У Асташкаўскім лагеры утрымлівалі каля 400 афіцэраў, усіх узятых у палон памежнікаў, жандарскіх чыноў, членаў вайсковых судоў, каталіцкіх святароў, некалькі тысяч паліцыянтаў [1, с. 10].

У суме ва ўсіх лагерах месцілася 14 500–14 800 палонных, з якіх 8 400 складалі афіцэры і адну трэцюю частку – інтэлектуальная эліта Польшчы: навукоўцы, гуманітарыі, інжынеры, настаўнікі, журналісты, літаратары, вядомыя грамадскія дзеячы, каля 800 дактароў [2, с. 98].

Вясной 1940 г. амаль усе яны па асабістаму ўказанню І. Сталіна былі вывезены і растраляны ў Катынскім лесе пад Смаленскам.

Цікава, што перад адпраўкай з лагераў усім палонным рабілі прышчэпкі супраць брушнога тыфу і халеры. Навошта – па сёняшні дзень невядома. Верагодна ў гэтым праявіўся тыповы беспарадак, які быў уласцівы савецкаму бюракратычнаму апарату, а таксама многаступенчатасць рашэнняў, калі адна інстанцыя НКУС не ведала, што робіць другая. Аднак найбольш верагодным падаецца, што гэта была гульня, мэтай якой было падмануць і заспакоіць пільнасць і насцярожанасць палонных. Ім таксама ўнушалі, што "они едут на Запад" (што, улічваючы геаграфічнае становішча лагераў, было нават праўдай). Ваеннапалонным выдалі нават сухія пайкі, загорнутыя (рэдкасць у СССР) не ў газетную, а ў абгортачную паперу.

З агульнай колькасці вязняў змагло ацалець толькі 449 чалавек [4, с. 116]. Расправы пазбегла група афіцэраў, якая праявіла гатоўнасць супрацоўнічаць з савецкімі ўладамі. У прыватнасці, гэта адносіцца да групы афіцэраў начале з палкоўнікам З. Берлінгам, якую ў кастрычніку 1940 г. перавезлі ў Маскву. На думку савецкага кіраўніцтва, якое ў гэты час ужо дапускала магчымасць вайны СССР з Германіяй, гэтая група павінна была стаць ядром невялікай польскай арміі, падмуркам будучых камуністычных сіл, галоўнай задачай якіх было б стварэнне ў Польшчы палітычнага рэжыму, паслухмянага волі Масквы. Як вядома, менавіта палкоўнік З. Берлінг быў прызначаны камандзірам І-й польскай дывізіі імя Т. Касцюшкі, а пасля – камандуючым польскай арміяй, якая была сфарміравана на тэрыторыі СССР. Ад савецкага камандавання ён таксама атрымаў званне генерала.

Савецкае палітычнае кіраўніцтва спадзявалася, што тайна катынскай трагедыі надзейна схавана пад тоўшчай смаленскай зямлі. Аднак неўзабаве наступіў момант трагічнага адкрыцця. На чыгуначных ветках пад Смаленскам у нямецкіх брыгадах летам 1942 г. працавалі палякі. Ад мясцовага насельніцтва яны даведаліся, што ў катынскіх лясах на берагах Дняпра, у 15-ці км на захад ад Смаленска, некалькі гадоў таму растрэльвалі палякаў. На гэтым месцы зазелянелі сасновыя парасткі. Нямецкія ўлады Смаленска паведамленням аб нейкіх магілах у катынскіх лясах спачатку не надалі ніякага значэння. Толькі ў сакавіку-красавіку 1943 г. пачаліся ў гэтых лясах узмоцненыя пошукі. І тады выбухнуў скандал, які ўразіў свет.

Група нямецкіх экспертаў прыступіла да эксгумацыі трупаў у пачатку красавіка 1943 г. Раскопкі пахаванняў вяліся галосна, з удзелам экспертаў з нейтральных краін. Былі таксама запрошаны прадстаўнікі Міжнароднага Чырвонага Крыжа, аднак запрашэнне было адхілена.

Знайшліся і сведкі з ліку мясцовых жыхароў, якія былі відавочцамі транспарціроўкі палонных у катынскі лес. Асаблівую каштоўнасць для нямецкіх уладаў уяўлялі паказанні двух жыхароў. Першым з іх быў 73-гадовы калгаснік Парфеній Кісялёў, які першым паказаў немцам месцы растрэлаў. Ён ахвотна дзяліўся з журналістамі з акупаванай Польшчы і нейтральных краін бачаным і пачутым. Верагодна, ён разлічваў на тое, што савецкая ўлада сюды больш ніколі не вернецца. У канцы 1943 г. гэты няшчасны чалавек апынуўся ў кіпцюрах НКУС. Больш яго ніхто і ніколі не бачыў, толькі друкавалі яго абвяржэнні ўсіх паказанняў, якія былі ім дадзены раней [1, с. 37].

Другім актыўным сведкам быў мясцовы каваль Іван Крыважэрцаў. Ён добра разумеў, што яго чакае і, калі немцы пачалі адступаць, сам падаўся на Захад. Даб-раўся да Германіі і перачакаў вайну. У маі 1945 г. Крыважэрцаў даў вычарпальныя паказанні па катынскай справе амерыканскім вайсковым уладам. Пасля вайны ён пасяліўся ў Англіі, схаваўшыся пад чужым імем і прозвішчам. Аднак савецкая разведка напала на яго след і ў кастрычніку 1947 г. яго знайшлі павешаным у прыгарадзе Лондана [1, с. 38].

Гітлераўская прапаганда шырока раструбіла аб злачынстве маскоўскага бальшавіцкага ўрада, што выклікала шырокі палітычны рэзананс у свеце. Яна таксама выклікала сур'ёзную заклапочанасць урадаў Вялікабрытаніі і ЗША. І Лондан, і Вашынгтон ні хвіліны не сумняваліся ў праўдзівасці нямецкага паведамлення. Аднак на палітычных меркаваннях (неабходнасць згуртаванасці саюзнікаў у барацьбе з Германіяй) уся інфармацыя па катынскай справе ўрадамі ЗША і Вялікабрытаніі была засакрэчана. Больш таго, гэтыя ўрады пайшлі ў той час на свядомую дэзінфармацыю: уся віна была ўскладзена на немцаў. Свет быў ужо ў дастатковай ступені падаўлены маштабамі гітлераўскіх злачынстваў, і прыпісаць немцам яшчэ адно злачынства не ўяўляла цяжкай працы. Толькі з пачаткам "халоднай вайны" заслона тайны катынскай трагедыі пачала на Захадзе паступова адкрывацца.

Пачынаючы з 1943 г. катынская справа прадвызначыла далейшыя адносіны Польшчы і СССР у перыяд вайны. Натуральна, што савецкі бок усклаў усю віну на фашысцкі ўрад. 15 сакавіка 1943 г. маскоўскае радыё выступіла са сваёй версіяй, абвінаваціўшы ў злачынстве Берлін. У сувязі з гэтым 20 красавіка польскі ўрад у выгнанні звярнуўся да савецкіх уладаў з нотай, у якой патрабаваў дакладнага вызначэння савецкай пазіцыі і ўсемагчымых дапаўняльных дадзеных. Адказу ад Масквы не паступіла. У сваю чаргу, 21 красавіка савецкі бок абвінаваціў польскі ўрад у выгнанні ў супрацоўніцтве з Гітлерам супраць саюзнікаў, а 26 красавіка СССР разарваў дыпламатычныя адносіны з польскім урадам, матывіруючы гэты крок – ні больш, ні менш – супрацоўніцтвам Польшчы з гітлераўскай Германіяй.

Пасля капітуляцыі Германіі ўрад Савецкага Саюза не прамінуў скарыстацца Нюрнбергскім працэсам, каб канчаткова замацаваць віну за катынскія злачынствы за Германіяй. Аднак міжнародны трыбунал адкінуў абвінавачванне нацысцкіх злачынцаў у забойстве ў СССР польскіх афіцэраў.

З юрыдычнага пункту гледжання гэта мела значэнне першараднай важнасці. Катынскае злачынства мела месца, польскія афіцэры забітыя, Германія па гэтай справе апраўдана, то хто ж тады з'яўляецца віноўнікам трагедыі…?

У пасляваеннай сацыялістычнай Польшчы на тэму Катыні панавала магільнае маўчанне. Галоўнай сілай, якая тармазіла тут распаўсюджванне праўды аб Катыні, быў апарат улады Польскай Народнай Рэспублікі, што, натуральна, не выклікала ніякіх пярэчанняў з боку савецкага кіраўніцтва. Толькі ў перыяд перабудовы ў СССР паступова пачала ўздымацца заслона тайны з катынскай справы.

Аднак гэтая тайна па сённешні дзень цалкам не раскрытая. Падставай для яе поўнага раскрыцця з'яўляецца даўно наспеўшая неабходнасць пераадолець гістарычныя раны, якія перашкаджаюць развіццю шчыльных добрасуседскіх адносін паміж народамі сучасных Расіі і Польшчы.

Моцны штуршок у справе поўнага высвятлення праўды аб Катыні надала найноўшая катынская трагедыя – катастрофа польскага борта № 1 з прэзідэнтам Польшчы Лехам Качыньскім вясной бягучага года ў небе пад Смаленскам.

Сёння многае ўжо вядома пра катынскую трагедыю, аднак няма адказу на галоўнае пытанне: што падштурхнула І. Сталіна і яго атачэнне да злавеснага рашэння? Магчыма, пра гэта мы ніколі не даведаемся, але можам выказаць наконт гэтага злачынства наступныя ўласныя меркаванні:

1. Для савецкага палітычнага кіраўніцтва была ўласціва апалагетыка класавага насілля, схільнасць вырашаць розныя праблемы і пытанні сілавымі метадамі. У

абліччы польскіх ваеннапалонных, многія з якіх адносіліся да эліты польскага грамадства, кіруючая вярхушка СССР бачыла сапраўднага класавага ворага: людзей с пачуццём чалавечага і вайсковага гонару, цвёрдых у сваіх маральных і ідэйных перакананнях, упэўненых у тым, што Савецкі Саюз – вораг, які нароўні з фашысцкай Германіяй імкнецца да ліквідацыі, або падпарадкавання польскай дзяржавы, і таму нясхільных да палітычных і маральных кампрамісаў. Як вядома, паводле бальшавіцкай формулы "калі вораг не здаецца, то яго знішчаюць".

2. У любой палітычнай сістэме, асабліва таталітарнай, афіцэр з'яўляецца галоўным і звычайна апошнім абаронцам дзяржавы. Нават знаходзячыся ў палоне, польскія афіцэры ўяўлялі сілу, якую савецкае кіраўніцтва ў сапраўдным часе і будучыні не магло выкарыстаць ў вырашэнні польскага пытання ў яго бальшавіцка-імперскім ўяўленні.

3. Пэўную ролю ў трагічных падзеях вясны 1940 г. , магчыма, адыгралі польска-савецкая і савецка-польскія войны 1919–1920 гг., а менавіта, паражэнне Чырвонай Арміі, правал палітыкі экспарту сацыялістычнай рэвалюцыі ў Польшчу і падпісанне Рыжскага міру 18 сакавіка 1921 г., паводле якога бальшавіцкі ўрад РСФСР вымушаны быў пагадзіцца на адыход да Польшчы Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Рэфлексія на гэтыя паражэнні магла падштухнуць да расправы над польскімі вайскоўцамі.

4. Ускосная віна за катынскую трагедыю кладзецца і на польскі эміграцкі ўрад, які своечасова, адразу пасля 17 верасня 1939 г., афіцыйна не вызначыў стан вайны Польшчы з СССР. Гэта пазбавіла інтэрнаваных палякаў правоў ваеннапалонных, пераўтвараючы іх, у разуменні савецкіх уладаў, у контррэвалюцыйныя элементы, затрыманыя са зброяй ў руках на тэрыторыі СССР.

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры**

1. Ежевский, Л. Катынь 1940. Издание 3-е. – Нью-Йорк, 1987. – 64 с.
2. Оскоцкий, В.Д. Катынь –имя нарицательное // Вопросы истории. – 2003. – № 6. – С. 94–108.
3. Яжборовская, И.С. Катынский синдром в советско-польских и российско-польских отношениях: историческая литература. – М. : Росспэн, 2001. – 496 с.
4. Катынская драма: Козельск, Старобельск, Осташков: судьба интернированных польских военнослужащих. – М. : Политиздат, 1991. – 200 с.

## «ЖЕНСКАЯ ДОЛЯ» ЕЛЕНЫ МАЗАНИК

***Занько Е.Ю.***
УО «Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина», г. Брест

Елена Мазаник родилась 4 апреля 1914 г. в деревне Поддегтярня Пуховичского района Минской области в крестьянской семье. В четыре года она потеряла отца, в семье осталось четверо детей. В 14 лет Лена попала в Минск – нянчить малыша у родственников. Она не только смотрела за ребенком, но и стирала на всю семью из восьмерых человек, убирала в доме и как-то еще успевала справляться с большим огородом. Перед работой Лена получала тонкий ломтик хлеба и чай. А после – до пяти часов вечера ничего: еда в том доме в отсутствие хозяев укрывалась под замками. Ей не платили за работу.

Потом она присматривала за другим ребенком, тоже у родственницы, и там ей было едва ли не тяжелее, чем у прежней. А после устроилась в столовую уборщицей, помогала официанткам, судомойкам. В той столовой было три Лены, и шеф-повар, старичок дядя Миша, придумал называть новенькую Галей. С той поры ее так звали многие, да она и сама так представлялась.